**39**. *Савенко Є.* Досвід роботи українського товариства «Вербиченька» у культурно-просвітницькому напрямку // Діаспора як чинник утвердження держави Україна у міжнародній спільноті: Перша міжнародна наукова конференція, 8–10 березня 2006 р. – Львів, 2006. – С. 286–290. **40**. *Сінельникова В.* Український ономастикон Нижньоволзького регіону: до питання збереження етнічності українців Волгоградської області РФ / В. Сінельникова // Діаспора як чинник утвердження держави Україна у міжнародній спільноті: сучасний вимір, проекція у майбутнє: Збірник матеріалів третьої Міжнародної науково-практичної конференції, 23–25 червня 2010 р. – Львів: Видавництво Львівської політехніки, 2010. – С. 258–263. **41**. *Скопенко В.* В Бібліотеці української літератури в Москві звільнено вже восьмого працівника-українця [Електронний ресурс]. – Режим доступу: http://kobza.com.ua/content/view/2067/86/. **42**. *Снєжкова І.* Діаспора українців у Росії / І. Снєжкова // Світове українство як чинник утвердження держави Україна у міжнародній спільноті «…землякам моїм в Україні і не в Україні…»: Збірник матеріалів четвертої Міжнародної науково-практичної конференції, 23–24 серпня 2013 р. (у рамках IV Міжнародного конгресу світового українства). – Львів: Видавництво Львівської політехніки, 2013. – С. 358–361. **43**. *Стадніченко О. І.* Проблема забезпечення прав національних меншин в міжнародних відносинах України і Російської Федерації: дис. на здобуття наукового ступеня кандидата політичних наук: 23.00.04 / Стадніченко Ольга Іванівна. – 220 с. **44**. У Москві фактично закривають бібліотеку української літератури [Електронний ресурс]. – Режим доступу: http://ukr.lb.ua/news/2015/02/27/297037_moskvi_faktichnoZ_zakrivayut.html. **45**. Украиноязычный оазис в Москве [Електронний ресурс]. – Режим доступу: http://kobza.com.ua/biblioteka-ukrainskoi-literatury/4705-ukrainoyazychnyj-oazis-v-moskve.html. **46**. *Чернієнко Д.* Історична україністика в сучасній Росії: стан і шляхи розвитку / Д. Чернієнко // Світове українство як чинник утвердження держави Україна у міжнародній спільноті «…землякам моїм в Україні і не в Україні…»: Збірник матеріалів четвертої Міжнародної науково-практичної конференції, 23–24 серпня 2013 р. (у рамках IV Міжнародного конгресу світового українства). – Львів: Видавництво Львівської політехніки, 2013. – С. 367–370. **47**. *Шевченко К.* Про планову «зачистку» Бібліотеки. Бібліотека української літератури або Як варвари намагаються замітати сліди середньовічного вандалізму [Електронний ресурс]. – Режим доступу: http://kobza.com.ua/content/view/2223/86/. **48**. *Шульга І.* Історія трансформації етнічної самосвідомості українців Низового Поволжя / І. Шульга // Діаспора як чинник утвердження держави Україна у міжнародній спільноті: сучасний вимір, проекція у майбутнє: Збірник матеріалів третьої Міжнародної науково-практичної конференції, 23–25 червня 2010 р. – Львів: Видавництво Львівської політехніки, 2010. – С. 281–285.

УДК 069

*Аляксей Бацюкоў*

## Украінскія артэфакты ў фондах Музея гісторыі Магілёва

*Олексій Бацюков*

## Українські артефакти у фондах Музею історії Могильова

*У статті описуються українські артефакти у фондах Музею історії Могильова, які репрезентують спільні культурні зв'язки і контакти білорусів та українців. Початок державності обох народів нерозривно пов'язаний із виникненням Київської Русі.*

**Ключові слова:** *Київська Русь, тризуб, початки державності, культурні зв'язки, Спиридон Соболь, Георгій Кониський, Андрей Шептицький, Митрофан Довнар-Запольський.*

*Aliaksei Batsiukou*

## Ukrainian Artifacts in the Collections in the Mahilou Museum of History

*This article describes the Ukrainian artifacts in the Museum of history of Mahilou (Belarus), reprezenting cultural ties and contacts between Beloratians and Ukrainians. The beginning of statehood of the both nations is inseparably linked with the emergence of Kievan Rus.*

**Keywords:** *Kievan Rus, the Trident, the Beginning of Statehood, Cultural Ties, Spiridon Sobol, George Konissky, Sheptytsky, Mitrofan Dovnar-Zapolski.*

*Алексей Батюков*

## Украинские артефакты в фондах Музея истории Могилёва

*В статье описываются украинские артефакты в фондах музея истории Могилёва, репрезентующие общие культурные связи и контакты булорусов и украинцев. Начало государственности обоих народов неразрывно связано с возникновением Киевской Руси.*

**Ключевые слова:** *Киевская Русь, тризуб, начала государственности, культурные связи, Спиридон Соболь, Георгий Конисский, Андрей Шептицкий, Митрофан Довнар-Запольский.*

Горад Магілёў, размешчаны ў верхняй плыні Дняпра, на працягу ўсяго свайго існавання знаходзіўся ў пастаянным, шчыльным кантакце з землямі сучаснай Украіны. Гэтая сувязь прадвызначаная: як наяўнасцю такой магістральнай транспартнай камунікацыі, як Днепр, так і адзінствам гістарычных лёсаў беларускага і ўкраінскага народаў. Фонды Музея гісторыі Магілёва ўтрымліваюць шэраг артэфактаў, якія яскрава дэманструюць нам гэтае адзінства лёсаў і непарыўную сувязь нашых рэгіёнаў.

Самым старажытным археалагічным помнікам на тэрыторыі гістарычнага цэнтра Магілёва з'яўляецца гарадзішча Змяёўка, размешчанае на беразе ракі Дубравенкі, правым прытоку Дняпра, і на тэрыторыі якога былі знойдзены артэфакты кіеўскай (II–V ст. н. э.) і калочынскай культур (V–VII ст. н. э.), што дазваляе лічыць старажытнае насельніцтва Магілёва гэтага часу носьбітамі адной этнакультурнай тоеснасці з насельніцтвам шырокага арэала, які ўключае тэрыторыі сучаснай Паўднёва-Ўсходняй Беларусі, Цэнтральнай і Паўночнай Украіны, Браншчыны, Куршчыны. Паводле этнічнай характарыстыкі насельніцтва гэтых культур пераважна характарызуецца як протаславянскае і славянскае. Зазначым, што раней насельніцтва гарадзішча Змяёўка памылкова адносілі да іншых археалагічных культур – да культуры штрыхаванай керамікі і тушамлінскай [1, с. 385].

У экспазіцыі Музея гісторыі Магілёва артэфакты з гарадзішча Змяёўка прадстаўлены падвескай-лунніцай кіеўскай культуры, бронзавымі бранзалетамі VI–VIII ст. калочынскай культуры. Таксама на тэрыторыі горада былі знойдзены і іншыя адзінкавыя знаходкі дадзенага перыяду – двухшыпны наканечнік дроціка і фрагменты керамікі калочынскай культуры.

У фондах музея ёсць таксама экспанаты, што датуюцца I тыс. г. н. э., якія былі знойдзеныя падчас археалагічных

пошукаў на тэрыторыі горада, і якія сведчаць пра паступленне сюды артэфактаў з паўднёвых рэгіёнаў – з тэрыторыі Украіны, альбо праз тэрыторыю сучаснай Украіны. Да ліку гэтых экспанатаў можна аднесці наканечнікі скіфскіх стрэл, наканечнікі гунскай стралы і наканечнік дроціка хазарскага тыпу. Дадзеныя артэфакты адносяцца да ранняга перыяду гісторыі славянства, калі землі Ўсходняй Еўропы, у тым ліку беларускія і ўкраінскія, былі ўключаныя ў тэктанічныя зрухі эпохі Вялікага перасялення народаў. Менавіта гэтым можна патлумачыць пранікненне сюды прадметаў іншых культур, артэфактаў з фондаў музея, што прадстаўляюць зусім аддаленыя рэгіёны – гэта рымскія манеты-дзенарыі, фібулы, фрагменты бронзавых вырабаў кельцкага тыпу.



Малюнак 1

Узнікненне ва Ўсходняй Еўропе буйной адзінай дзяржавы з цэнтрам у Кіеве ў часы княжання Уладзіміра Святаславіча імгненна знайшло сваё адлюстраванне ў магілёўскіх археалагічных матэрыялах. Тут варта адзначыць, што ў гэты час сталае паселішча на тэрыторыі сучаснага гістарычнага цэнтра горада перамяшчаецца з урочышча Змяёўка на ўзгорак, які пазней будзе называцца Замчышча – гэта Замкавая гара пры ўпадзенні Дубравенкі ў Дняпро. Менавіта канцом X – пачаткам XI ст. датуецца цэлы шэраг знаходак, зробленых на Замчышчы, з геральдычным знакам Уладзіміра – "трызубам". Гэта прадстаўленыя ў фондах музея каменная пячатка з выявай княскага "трызуба" Уладзіміра Святаславіча, донцы гаршчкоў з клеймамі ў выглядзе "трызуба", падвеска з выявай "трызуба" на адным баку і з стылізаванай выявай дрэва на другім. Гэтыя артэфакты, а таксама вялікая колькасць прадметаў, характэрных для дружыннікаў эпохі Кіеўскай Русі, сведчаць пра тое, што ў к. X – пач. XI ст. Магілёў стаў цэнтрам феадальнай сядзібы-вотчыны, а таксама, магчыма, месцам збору падацяў і выконваў функцыі памежнай крэпасці [3, с. 5]. Дадзеныя археалогіі, нажаль – адзінае, што пралівае святло на гэты найбольш старажытны перыяд існавання горада, які паводле закладзенай у XIX ст. традыцыі лічыцца заснаваным у 1267 г.

Адзін з экспанатаў музея дэманструе нам і тое, калі Магілёў, верагодна, выходзіць з-пад улады Кіева як метраполіі. Гэта донца гаршчка з кляймом у выглядзе "трызуба" Усяслава Ізяславіча (княжыў у 1001–1003 гг.), што належыў да полацкага адгалінавання Рурыкавічаў (гл. малюнак 1). Магчыма, уваходзячы ў склад полацкіх уладанняў нашчадкаў Рагнеды і яе сына Ізяслава, Магілёў функцыянаваў у далейшым у якасці памежнай крэпасці Полацкай дзяржавы. Аднак варта адзначыць, што ў першай летапіснай згадцы пра горад, у "Спісе рускіх гарадоў далёкіх і блізкіх", складзеным у 1380–90-я гг., Магілёў аднесены да гарадоў кіеўскіх.

Акрамя прадметаў з выявамі "трызуба", у фондах УК "Музей гісторыі Магілёва" маюцца таксама экспанаты, якія па тэхналогіі свайго вырабу дэманструюць пра шырокія эканамічныя сувязі паміж Магілёвам і тэрыторыямі сучаснай Украіны ўжо ў XII–XIII ст. Да іх ліку можна аднесці фрагменты шкляных бранзалетаў, у тым ліку філігранныя, што вырабляліся ў кіеўскіх майстэрнях з канца XII ст.; праселкі з оўручскага сланца-шыфера; рэльефны бронзавы багародзічны энкалпіён, які мае шматлікія аналагі ў кіеўскіх археалагічных матэрыялах XIII ст. [5, с. 57]. Гледзячы па шматлікіх археалагічных знаходках, што прадстаўлены ў экспазіцыі музея ў выглядзе экспанатаў, акрамя паўднёвага накірунку, гандлёвыя сувязі Магілёва развіваліся таксама на поўнач – пра гэта сведчаць шматлікія скандынаўскія артэфакты XI–XIII ст. – гэта найперш амулеты, зброя і прадметы асабістай гігіены.

Варта адзначыць, што на працягу стагоддзяў потым прадстаўнікі інтэлектуальнай эліты горада ў сваіх творах нярэдка будуць звяртацца да Кіева і Кіеўскай Русі як да вобразаў, звязаных з пачаткамі дзяржаўнасці і культуры. Так, даследуючы феномены масавай свядомасці жыхароў Магілёва ў XVI–XVII ст., у сваёй манаграфіі "Людзі даўняй Беларусі" магілёўскі гісторык, прафесар І. Марзалюк прыйшоў да высновы, што жыхары Беларусі часоў ВКЛ і Рэчы Паспалітай пачаткі дзяржаўнай традыцыі звязвалі з Кіевам, а не Полацкам [4, с. 121].

Наступныя перыяды гісторыі Магілёва прадэманстраваныя ў музеі вялікімі комплексамі экспанатаў, што рэпрэзентуюць усе асноўныя гістарычныя эпохі, праз якія прайшоў горад. Так, наканечнікі мангольскіх стрэл-зрэзняў – пры тым, што культурны слой другой паловы XIII ст. гаворыць пра буйны пажар – сведчаць пра верагоднасць знішчэння горада падчас нашэсця хана Батыя. Пачынаючы з XVI ст. Магілёў перажывае бурны эканамічны рост, што зробіць горад адным з самых вялікіх на тэрыторыі Ўсходняй Беларусі.

З гэтага часу культурныя, эканамічныя, палітычныя кантакты жыхароў горада з украінскімі землямі будуць адбывацца непарыўна. Так, вядома, што магілёўскія купцы ў XVI–XVIII ст. вялі гандаль з Кіевам, Ноўгарад-Северскім, Каневым, Чаркасамі, Жытомірам, Луцкам, Львовам, Белай Царквой, Канстанцінавам і іншымі украінскімі гарадамі. Шмат магілёўскіх купцоў прыбывала на ўкраінскія кірмашы. Так, у 1646 г. на кірмаш у Ноўгарад-Северскі прыехала звыш за 150 магілёўскіх купцоў, якія прывезлі на продаж тавараў больш чым на 400 вазах [6, с. 116].

Гандлёвыя сувязі Магілёва і ўкраінскіх гарадоў забяспечваліся ў першую чаргу наяўнасцю Дняпра як воднага шляху, але ў познім сярэднявеччы да гэтай магістралі дадаўся таксама сухапутны шлях, які звязваў Магілёў і Кіеў, і які па сведчаннях сучаснікаў быў самым шматлюдным. На тэрыторыю Ўкраіны магілёўскія купцы везлі на продаж рамесныя вырабы (скураныя тавары, вопратку), вырабы з футра (шубы, аўчыны), і нават хлеб, мёд і воск. З украінскіх гарадоў прывозіліся дарагія, пераважна ўсходнія тавары – турэцкія дываны, шоўк і шаўковыя тавары, тканіна [6, с. 116–117]. Папулярнасць падобных тавараў на беларускіх землях вызначалася спецыфікай шляхецкай самаідэнтыфікацыі ў познім сярэднявеччы, калі беларуская шляхта лічыла сябе прадстаўнікамі сармацкай, г. зн. усходняй крыві і культуры.

Таксама і ўкраінскія купцы прывозілі свае тавары ў Магілёў, карыстаючыся бязмытным гандлем у межах Вялікага княства Літоўскага. Так, у траўні 1577 г. кіеўскія купцы Васіль Быхаўскі і Севасцян Турчыновіч даставілі ў Магілёў партыі "чырвонага бурскага" шоўку, крамныя рэчы, соль "столпястую" і іншыя тавары [6, с. 116–117].

Культурныя сувязі Магілёва з украінскімі землямі, і ў першую чаргу з Кіевам цяжка пераацаніць. Гэтаму ў першую чаргу спрыяла рэлігійнае адзінства – Магілёў у XVI–XVIII ст. заставаўся адзіным горадам на беларускіх землях, дзе захавалася праваслаўная епархія. Архіўныя крыніцы сведчаць пра тое, што культурнае ўзаемадзеянне адбывалася натуральным чынам – вялікая колькасць культурных дзеячоў Магілёва праходзілі навучанне ва ўкраінскіх рэлігійных адукацыйных установах, а таксама шматлікія выпускнікі апошніх займалі пасады ў магілёўскай епархіі [2]. Характэрны прыклад – магілёўскі мешчанін, паэт Фама Яўлевіч, аўтар паэмы "Лабірынт" (1625 г.). Пасля навучання пісьму ў школе Магілёўскага Спаскага брацтва, ён працягваў адукацыю ў Кіеўскай Богаяўленскай брацкай школе, затым, пасля заканчэння Ягелонскага універсітэта выкладаў у Кіеўскай брацкай школе, а ў 1628 г. заняў пасаду яе рэктара, змяніўшы на гэтай пасадзе М. Сматрыцкага. Пазней ён вернецца з Кіева ў Магілёў і працягне тут педагагічную дзейнасць [8, с. 3]. Паэма Фамы Яўлевіча раскрывае для нас спецыфіку нацыянальнай і культурнай ідэнтычнасці магілёўскага мешчаніна канца XVI – пачатку XVII ст. Пафас твору быў накіраваны на тое, каб схіліць чытача да нацыянальна-культурнага адраджэння, якое ён бачыў у адраджэнні славутай славянскай мінуўшчыны Ўсходняй Еўропы. Звяртаючыся да мяшчанскага саслоўя і да "именитого народа Славянского" беларускіх і украінскіх земляў, ён імкнуўся аднавіць у яго гістарычнай памяці перыяд высокага культурнага ўзлёту гэтага краю – значнае месца ў яго творы займае апраўданне сучаснага яму занядбання з заклікам узгадаць веліч і прыгажосць старажытных Кіева, Галіча, Магілёва [8, с. 16].

Знакавымі асобамі ў гісторыі Магілёва XVII–XVIII ст. стануць культурныя дзеячы, лёс якіх таксама звязаў беларускую і ўкраінскую культуры – гэта друкар Спірыдон Собаль, праваслаўны біскуп Георгі Каніскі. Гэтыя выбітныя асобы ўваходзяць у плеяду самых вядомых і шанаваных дзеячоў культуры ў гісторыі Магілёва, іх выявы размешчаныя ў партрэтнай галерэі знакамітых магілёўцаў, што знаходзіцца ў зале ўрачыстых мерапрыемстваў Ратушы (дзе і размяшчаецца Музей гісторыі Магілёва).

У фондах УК "Музей гісторыі Магілёва" нажаль, адсутнічаюць арыгінальныя выданні Спірыдона Собаля. Музею пакуль што ўдалося атрымаць толькі выданні, слаба звязаныя з культурнай спадчынай магілёўскага першадрукара – гэта факсімільныя перадрукі маскоўскай друкарні адзінаверцаў выданняў В. Бурцава-Пратапопава "Буквара" 1637 г. і "Трэбніка" 1642 г. (1885 і 1856 гг. адпаведна) якія, як вядома, былі зробленыя маскоўскім друкаром пад непасрэдным уплывам і з выкарыстаннем друкарскіх матэрыялаў Собаля – шрыфтоў і заставак.

Творчая спадчына Георгія Каніскага прадстаўлена ў музеі экзэмплярам кнігі "Собрание сочинений Георгия Конисского, архиепископа Белорусского" Ч. 2, выдадзеным у Санкт-Пецярбургу ў 1835 г. магілёўскім святаром, протаіерэем Іванам Грыгаровічам. Гэтая кніга ўтрымлівае вершы, філасофскія думкі, паштовую перапіску Георгія Каніскага, а таксама яго гістарычнае даследаванне "Историческое известие о Епархии Белорусской…" (с. 183–207).

Сярод калекцый у фондах Музея гісторыі Магілёва адна з самых значных – гэта калекцыя старадрукаў. Яна змяшчае такія нацыянальныя каштоўнасці, як адзіны ў Беларусі экзэмпляр Статута ВКЛ 1588 г., кнігу Казіміра Семяновіча "Вялікае мастацтва артылерыі" (Франкфурт-на-Майне, 1676 г.), а таксама выданні магілёўскай брацкай друкарні канца XVII–XVIII ст. Гэта "Дзіоптра" 1698 г., "Жыціе святых" 1702 г., "Часоўнікі" і "Псалтыры" 1703–1773 гг. Некаторыя з гэтых артэфактаў з'яўляюцца яскравымі сведкамі украінска-беларускіх культурных сувязяў і ўзаемаўплываў. Так, беларускі даследчык магілёўскай школы кнігадрукавання А. Пікулік зазначае, што параўнанне украінскіх кніжных выданняў XVII–XVIII ст. з магілёўскімі выданнямі дэманструе, што апошнія нарэдка знаходзіліся пад уплывам украінскіх кніжных традыцый. Праяўлялася гэта як у падборы кніг для выдання, так і ў непасрэдным запазычанні асобных кампазіцый і іх дэталяў. Выяўленыя шматлікія запазычанні магілёўскімі майстрамі заставак і канцовак з украінскіх (страцінскіх, львоўскіх, кіеўскіх) выданняў XVI–XVII ст. сведчаць пра агульныя мастацка-эстэтычныя пошукі беларускіх і ўкраінскіх майстроў [7].

Тэматычна асноўная экспазіцыя Музея гісторыі Магілёва абмежавана эпохай дзейнасці магдэбургскага права, рэпрэзентуючы ў сваёй экспазіцыі менавіта гэты перыяд – перыяд найвышэйшага культурнага, эканамічнага і палітычнага ўздыму ў гісторыі горада. Аднак у яго фондах маюцца таксама прадметы і пазнейшых эпох, якія могуць быць цікавыя даследчыкам украінска-беларускіх культурных кантактаў, украіназнаўцам.

Да экспанатаў, якія выклікаюць навуковы інтарэс і для беларускага і для украінскага даследчыка, будзе, напрыклад, адносіцца кніга-зборнік, канвалют, атрыманая музеем у 2013 г., якая складаецца з 25 навуковых артыкулаў і брашур беларускага гісторыка Мітрафана Доўнар-Запольскага, выдадзеных у 1880-х – 1900-х гг. Як вядома, Мітрафан Віктаравіч Доўнар-Запольскі вучыўся, працаваў у Кіеўскім універсітэце і тут стварыў навуковую школу, і адначасова ён з'яўляецца родапачынальнікам беларускай гістарыяграфіі. Дадзены артэфакт утрымлівае такія работы, як нарыс "К истории экономического быта в Галиции", крытыку на кнігі Д. Міллера "Очерки из истории и юридического быта старой Малороссии" і П. Іванова "Исторические судьбы Волынской земли с древнейших времён до конца XIV века", якія будуць, магчыма, цікавымі ўкраінскаму даследчыку. Але таксама зборнік утрымлівае работу, дагэтуль не даследаваную і не вядомую ў бібліяграфіі Доўнар-Запольскага – гэта рэцэнзія на кнігу "Записки Сергея Григорьевича Волконскаго (декабриста). Издание князя М. С. Волконского, СПб, 1901", што была выдадзена ў "Журнале министерства народного просвещения".

У гэтым артыкуле аўтар падкрэслівае некалькі новых звестак, што ўтрымліваюцца ў "Записках" і маюць значэнне для дакладнага аднаўлення падзеяў напярэдадні паўстання дзекабрыстаў. Аднак М. Доўнар-Запольскі заўважае, што па сваёй інфарматыўнасці "записки дают много нового и интересного в области военного быта. По отношению к истории тайных обществ, они далеко не оправдывают ожиданий, которые возбуждает само имя автора".

Дадзены зборнік уяўляе сабой падшыўку з адбіткаў з публікацый, падрыхтаваных да друку, што ў адпаведнасці з тагачаснай друкарскай практыкай выдаваліся аўтару ў 1–2 экзэмплярах. На адной са старонак кнігі маецца ўласніцкі запіс з пералікам змешчаных у кнізе артыкулаў. Почырказнаўчая экспертыза магла б дапамагчы вызначыць, ці належыў дадзены зборнік самому Мітрафану Віктаравічу Доўнар-Запольскаму.

Яшчэ адзін артэфакт з фондаў Музея гісторыі Магілёва можа быць цікавы для даследавання ўкраінскай культуры.

Гэта кніга “Теория Древле-Русскаго церковнаго и народнаго пения на основании автентических трактатов и акустическаго анализа» Ю. Арнольда (М., 1880 г.) з экслібрысам мітрапаліта Андрэя Шэпціцкага. Гісторыя паходжання дадзенага артэфакта наступная. Магілёўскі калекцыянер кніг перадаў яе ў музей, распавёўшы, што яму вялікую калекцыю кніг прадаў сын былога супрацоўніка НКВД, які ў сталінскія часы працаваў на Львоўшчыне. Паводле расповедаў гэтага былога супрацоўніка НКВД, займаючыся арыштамі жыхароў Львоўшчыны, ён заадно забіраў у сваю ўласнасць кнігі з іх асабістых бібліятэк. Акрамя кнігі з экслібрысам А. Шэпціцкага такім чынам у фонды музея трапіла таксама кніга “Дзіоптра”, надрукаваная ў магілёўскай брацкай друкарні ў 1689 г.

Такім чынам, як мы бачым, фонды Музея гісторыі Магілёва змяшчаюць шэраг артэфактаў, якія рэпрэзентуюць агульныя для беларускага і ўкраінскага народаў палітычныя, этнакультурныя і канфесійныя працэсы, дэманструюць доўгатэрміновае ўзаемапранікненне нашых культур і традыцый.

**1**. Археалогія і нумізматыка Беларусі: Энцыкл. / Беларус. Энцыкл.; Рэдкал.: В.В. Гетаў і інш. – Мн.: БелЭн, 1993. – 702 с. **2**. *Кагамлик С. Р.* Києво-Печерська лавра: світ православної духовності і культури (XVII–XVIII ст.) / Світлана Кагамлик. – К., 2005. – 552 с. **3**. Магілёўская даўніна ў пытаннях і адказах / А. Р. Агееў, І. А. Марзалюк, І. А. Пушкін. – 2-е выд. – Магілёў, 1999. – 240 с. **4**. *Марзалюк І. А.* Людзі даўняй Беларусі: этнаканфесійныя і сацыякультурныя стэрэатыпы (X–XVII ст.). – Магілёў: МДУ імя А. А. Куляшова, 2003. – 324 с. **5**. *Марзалюк І. А.* Магілёў у XII–XVIII ст. Людзі і рэчы / Навук. рэд. Я. Р. Рыер. – Магілёў; Мінск: “Веды”, 1998. – 260 с. **6**. *Мелешко В. И.* Могилев в XVI – середине XVII в. / Под ред. З. Ю. Копысского. – Мн.: Наука и техника, 1988. – 264 с. **7**. *Пикулик Е. Н.* Заставки в могилевских братских изданиях XVII–XVIII веков: белорусско-украинские связи. // Українська писемність та мова в манускриптах і друкарстві. Матеріали 1-ї і 2-ї науково-практичних конференцій 10–11 листопада 2010 р. 9 листопада 2011 р. До Дня української писемності та мови. – К., 2012. – 260 с. **8**. *Старостенко В. В.* «Лабиринт» Фомы Иевлевича: Из истории национально-культурной и религиозной жизни Беларуси конца XVI – первой половины XVII вв. – Могилев, 1998. – 60 с.

УДК:929(477)”18-19“:37.014

*Юрій Беззуб*

## Борис Грінченко в боротьбі за українську школу: стосунки з Христиною Алчевською

*У статті розкриваються взаємини Б. Грінченка з Х. Алчевською в кінці XIX – на початку XX ст., коли обоє активно працювали на ниві народної освіти, зокрема в школі с. Олексіївки Катеринославської губернії. Показано, що різниця світоглядних засад і національних переконань не дозволили педагогам стати однодумцями в меті народної освіти і зумовили напружені стосунки між ними. Взаємини з Х. Алчевською – цінне джерело для розуміння громадсько-педагогічних поглядів Б. Грінченка.*

**Ключові слова:** *народна освіта, педагогічні погляди, національна самосвідомість, українофільство, український рух.*

*Yuriy Bezzub*

## Boris Hrinchenko in the Struggle for Ukrainian School: Relations with Hrystyna Alchevska

*The specific examples disclosed relationships between B. Hrinchenko and H. Alchevska in the late XIX – early XX century, when both were active in the field of public education, particularly in Oleksiivka rural school in Katerynoslav province. It is shown that different national ideological principles and beliefs do not allow the both teachers to become associates in the main – purpose of education and led to strained relations between the two figures. Relations with H. Alchevska are the valuable source for understanding B. Hrinchenko’s the social and educational views.*

**Keywords:** *Public Education, Pedagogical Views, National Identity, Ukrainophilie, Ukrainian National Movement.*

*Юрий Беззуб*

## Борис Гринченко в борьбе за украинскую школу: отношения с Христиной Алчевской

*В статье раскрываются взаимоотношения Б. Гринченко и Х. Алчевской в конце XIX – начале XX в., когда они активно работали в области народного просвещения, в частности в школе с. Алексеевки Екатеринославской губернии. Показано, что разные мировоззренческие взгляды и национальные убеждения не позволили педагогам стать единомышленниками в цели народного образования и обусловили напряженные отношения между ними. Взаимоотношения с Х. Алчевской – ценный источник для понимания общественно-педагогических взглядов Б. Гринченко.*

**Ключевые слова:** *народное образование, педагогические взгляды, национальное самосознание, украинофильство, украинское движение.*

В останні десятиліття творчу особистість й педагогічну спадщину Бориса Грінченка заслужено дослідники відносять до когорти видатних українських діячів другої половини XIX – початку XX ст. Одним із цікавих сюжетів його громадської й педагогічної діяльності є стосунки з Христиною Алчевською, відомим тоді педагогом-просвітителем, бібліографом, публіцистом, засновницею першої в Росії приватної жіночої недільної школи для дорослих (1862), якою вона керувала понад 50 років. За її ініціативою й участю була видана «Книга взрослых» (1899–1900) для 3-річного навчання неписьменних, яка до 1917 р. витримала 10 видань, та тритомний анотований покажчик рекомендованих книг для народного читання «Что читать народу?» (1884–1906), що на виставках в Антверпені, Чикаго і Парижі отримав високі нагороди. Педагогічна діяльність Алчевської здобула визнання на Міжнародному конгресі приватної ініціативи у справі народної освіти (Франція, 1889), її обрано віце-президентом Міжнародної ліги освіти.

У різні часи взаємини між двома діячами були предметом зацікавлень багатьох дослідників: М. Грінченко (Загірньої) [5], А. Погрібного [14, 15, 16], Б. Пастуха [11], О. Неживого [7, 8, 9], Л. Неживої [6], Д. Пісочинця [13], Л. Грузинської [4], М. Одінцової [10], Д. Снісаренка [17], С. Світленка [16] та ін. Однак, зважаючи на дражливість їхніх стосунків, науковці уникали однозначних оцінок, отож питання досі залишається до кінця нез’ясованим.